
Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.



Беларуская Борць

Месячнік пчалярства і мядова-лекарскіх зёлак

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі Вільня, вул. Каралеўская, 3-8. Рэдакцыя адчынена ў аўторкі і пятніцы ад 10-12 гадз.

Падпісная плата да канца году 2 зл. Заграніцу -ўдвая даражэй
Цана асобнага нумару -50 гр.
Цана абвестак паводле умовы.

№ I. Вільня, Жнівень 1934 г. Год I.

Ад Рэдакцыі.

Сумна і сорамна, што пасьля "буйных узростаў", „шырокага разьвіцьця", нам прыходзіцца выдаваць сваю часопісь, так сказаць дагутэнбэргаўскім спосабам. Хто ў гэтым вінават? -Ніхто, апрача нас саміх: "Самі мы вінаваты ў нашай долі праклятай, у тым, што век гаруем і плачам" -кажа прарок нашага адраджэньня Янка Купала. Віна наша у тым, што мы да гэтага часу не стварылі нічога пазытыўнага, не стварылі ніводнай эканамічнай базы, на якой у мінуту трудную можна было-б абаперціся, а праўвесь час як дзеці, бавіліся мыльнымі пузырамі, удаючы, што робім вялікую справу. Адны з нас распыляліся ў сусьвеце і згодна прынцыпу "ніякае ільлюзіі аб паправе свайго быту пры сучасным капіталістычным ладзе", -нічога не рабілі, а толькі пратэставалі і пратэставалі; другія даказвалі, што ўсё будзе добра, толькі трэба ветліва прасіць ды чакаць , а трэцьція крытыкавалі і адных і другіх ды ізноў нічога не рабілі.

Коратка кажучы нічога не рабілася, каб паправіць жыцьцё нашага народу ці прынамся хоць крыху яго аблягчыць сёньня, ужо.

І ў рэзультаце -Рэзультаты сумныя.

Што-ж рабіць, каб больш такіх памылак не паўтараць, каб ня шукаць больш апекі? -Адказ ясны: трэба тварыць свае гаспадарчыя арганізацыі ні зважаючы ні навошта, бо трэба ведаць, што ў найгоршыя часы тварыліся найсьвятлейшыя ідэі. У часы вялікіх крызысаў зарадзілася й коопэрацыя, якая ў некаторых старонках, як напрыклад у Даніі, падняла дабрабыт сялянства на такую вышыню, аб якой нашаму селяніну й ня сьнілася. Дык возьмемся й мы за працу, але так, як селянін за свой загон. Арэ, сее. Адзін год ня ўродзіць, другі, а на трэці, ня праўда, будзе карысьць.

Бяручы гэта пад увагу Т-ва "Пчала" ўзнавіла сваю дзейнасьць. Ужо праведзяны завочныя курсы па зьбіраньні, сушэньні і г.д. мядова-лекарскіх зёлак, завязваецца сувязь з краёвымі і заграніцьнымі фірмамі дзеля збыту зёлак. Зараз выпушчаем першы нумар нашае часопісі, якая павінна стацца органам Т-ва "Пчала". Мы ведаем, што шмат спаткаем на сваей дарозе розных "аптымістаў", якія махнуць рукой ды скажуць: -э, з гэтага нічога ня будзе. Вось, каб тое ды гэна, а галоўнае, каб хто даў грошы, дык тады... Грамадзяне, ніхто грошы дарма не дае: хто дасьць грошы, той скажа рабіць яго работу.

І мы прыступаем да працы бяз грошы, веручы, што грамадзянства прыйдзе нам з дапамогаю матэрыяльна і маральна. Бяром мы галоўным чынам дзьве галіны -пчалярства ды збыт мядова-лекарскіх расьцін і дзеля гэтага перадусім зьвяртаемся да пчаляроў ды былых курсантаў Т-ва "Пчала"

Пчаляры! Ад Вас залежыць разьвіцьцё і Т-ва "Пчала" і нашае ды Вашае часопісі. Ведайце, што ў Вашых інтарэсах ляжыць разьвіцьцё іх. Запісвайцеся ў сябры Т-ва і выпісвайце сваю часопісь, у якой знойдзеце фаховыя парады, як гаспадарыць у пчальніку, як і дзе лепей збыць мёд і воск і гэтым самым павялічыце дабрабыт і свой і сваей старонкі.

Той, хто цікавіцца справаю зёлак і захоча працаваць у гэтай галіне знойдзе ў нас і фаховыя парады і дадзеныя аб цэнах і запатрэбаваньнях рынку, і ўсе, што дапаможа яму выкарыстаць і гэтае багацьце нашага краю.

Дык за працу. Першы № "В.В." высылаем усім як пробны, на далейшыя прысылайце падпіску; прысылайце карэспандэнцыі аб ліку і стане пчальнікоў, аб мёдазборы; прысылайце цэны на мёд і воск; зварачывайцеся з усімі пытаньнямі, якія маеце ў справах пчалярскіх і справах лекарскіх зёлак. Нехай завяжацца паміж "В.Б." і яе чытачамі моцная шчырая сувязь, якая злучыць усіх пчаляроў беларусаў у адну вялікую нацыянальна-сьвядомую і эканамічна сільную сямью.

Прадукцыя мёду і яго прадажа.

Большасьць нашых пчаляроў гоніцца за выпрадукаваньнем якнайбольшай колькасьці мёду, мала дбаючы аб яго якасьці. Кожны прадукт, кожны артыкул гандлю, лягчэй прадаць і то прадаць з добрым зыскам, тады, калі ён высокай якасьці. Гэтаксама і з мёдам.

Мёд сьпелы, густы, чысты і добрады прыгожа апакаваны хутка знайдзе купца і аплаціць нам нашу працу. Тым . ам пчаляры, адны змушаныя безграшоўям, а другія проста праз хціваcьць выбіраюць часта мёд нясьпелы, зусім рэдкі. Гэтакі мёд у сьвежым стане ня мае ні добрага выгляду, ні смаку, бо мае ў сабе шмат вады, цукруецца /асядае/ вельмі трудна, прытым цукруецца сьсподу пасудзіны, а зьверху астаецца рэдкім.

Нясьпелы мёд пасьля некаторага часу кісьне. Часта нават невялікая колькасьць нясьпелага мёду можа папсаваць увесь збор, бо нясьпелы мёд як рэдкі ўсплывае на верх, а тут на яго нападаюць шкодныя грыбкі.

Калі хто змушаны выбраць мёд нясьпелы, то павінен яго высьпеліць штучна, наліўшы ў шырокія плоскія пасудзіны і паставіўшы іх накрытыя марляй або драцяной сеткай на сонячным месцы. Праз некалькі дзён лішняя вада выпаруе і мёд згусьцее.

Кожны мёд чысты і сьпелы зьяўляецца вельмі цэнным спажыўным прадуктам, але па свайму складу, паху і коляру ён залежны ад тых расьцін, з якіх яго пчолы зьбіралі. І так бываюць мёды сьветлыя: з ліпы, акацыі, дзяцеліны, маліны і г.д., і цёмныя: з грэчкі, верасу і г.п. На жаль у нас вельмі рэдка пчаляры адбіраюць асобна мяды сьветлыя і цёмныя, найчасьцей мяшаюць усё разам і атрымліваюць коляр пасярэдні, хіба што ў данай ваколіцы пераважае мёд аднаго коляру і гатунку. Падзелу на гатункі г.зн. мяды ліповыя, грэчаныя і г.д. амаль што ня бывае. Хаця ў прадажы спатыкаецца вельмі часта мёд з назовам "ліпцовага", але папраўдзе ён мае ў сабе больш "ліпеня" /месяц/, чым ліпы.

Праўду кажучы агульная маса спажыўцоў ... знаецца ані на гатунках мёду, ані на коляры, а тым меньш на яго складовых частках. Часта нават не адрозьніваюць мёду натуральнага-праўдзівага ад фальшаванага.

Трэба прызнаць, што большасьць спажыўцоў ня мае магчымасьці практычна зазнаёміцца з добрымі якасьцямі мёду, бо ў вялікіх гандлёвых прадпрыемствах, якія куплююць мёд у маёнтках абшарнікаў, дзе пчалярская гаспадарка найчасьцей вядзецца рацыянальна, ён мае стасункова высокую цану, бо апошнюю часта збольшвае вартасьць дарагой упакоўкі.

А наш малазямельны пчаляр ... мёду вядзе зусім бясплянова і неарганізавана. Кожны паасобна стараецца прадаць мёд якнайхутчэй першаму лепшаму гандляру або агэнту, амаль ня кожны прадае па іншай цане, а ўжо мала хто дбае аб далейшы лёс свайго мёду - у якім стане ды выглядзе дойдзе ён да рук спажыўца. Часта бывае, што нясумленны гандляр мёд сфальшуе, а спажывец атрымаўшы дрэнны тавар траціць да яго апэтыт і дзеля гэтага запатрэбаваньне на мёд ня толькі не ўзрастае, але наадварот - паменьшаецца.

І бяз гэтага запатрэбаваньне на мёд у нас вельмі не вялікае. Людзі не дацэніваюць спажыўнай і лекарскай вартасьці мёду і часта ўважаюць мёд за ласушкі бяз якіх лёгка можна абыйсьціся. У іншых краёх прапаганда ужываньня мёду, як прадукту штодзеннай патрэбы, вядзецца даўно і рознымі спосабамі. Дзякуючы гэтакай прапагандзе ў Амэрыцы напрыклад, як бачым з пчалярскай прэсы, мёд зьяўляецца амаль ня штодзеннай стравай ў самай беднай сямьі, прынамсі для дзяцей. Францыя і Нямеччына ўвозяць з заграніцы мёд у сотках кіллграмаў. Англія, у якой пчалярства удаецца слаба, дзякуючы прапагандзе амэрыканскіх пчаляроў, увозіць да сабе штогод сотні вагонаў мёду. Украінскія пчаляры узяліся гэтак сама за пляновую прапаганду праектуючы выдаваць і раскідаць па краю лятучкі, выдаваць адносныя брашуры, ды арганізаваць курсы вырабу пітных мёдаў і курсы мядовых пераробаў: пернікаў, тортаў, макаўнікаў і г.д.

Украінскія пчаляры лічаць, што мёд можна будзе прадаваць масова, калі: I/ даць на рынак мёд сьпелы, чысты і добра апакаваны; 2/ прадаваць мёд выключна праз свае пчалярскія і кооперацыйныя арганізацыі; 3/ калі ўсе пчаляры згуртуюцца каля сваіх пчалярскіх арганізацыяў, узмоцняць іх ды разбудуюць; 4/ калі патрапяць зарэклямаваць свой мёд, як прадукт здаровай

спажывы, так што ён зробіцца неабходным у кожнай сямьі.

Як бачым справу прадажы мёду стараюцца паставіць на лепшую дарогу.

Нам астаецца узяць іх пачынаньні пад увагу і падумаць аб неабходнасьці арганізаваньня збыту мёду і ў нас у Зах. Беларусі.

З. Верас.

Ад рэдакцыі. Просім паважаных Грамадзян Пчаляроў падаць свае увагі, думкі і праекты ў гэтай балючай справе.

Л. Войцікава.

Медадайныя расьціны.

Ня толькі людзі незнаёмыя з пчалярствам, але нават шмат пчаляроў лічыць пчолы такой жывёлінай, якой ні карміць, ні паіць ня трэба.

Гэтак магло быць даўней, але ў нашыя часы, калі лясы зьнішчаныя, папары загараныя і нават лепшыя няўжыткі прыведзяныя да культурнага стану, невялікі лік садоў і сенажацяў, крыху прыдарожных дрэваў і малы пажытак з абсеяных палёў ня можа здаволіць патрэбаў пчол, а прынамсі робіць іх працу вельмі цяжкой і непрадуктыўнай.

Дзеля гэтага пчаляры, якія хочуць мець больш карысьці са сваей пчалярскай гаспадаркі, павінны даць пчолам падмогу. Не кажу, каб абсяваць цэлыя гэктары расьцінамі выключна медадайнымі, якія і ў іншы які небудзь спосаб не даюць даходу, гэта бы не аплачывалася і пры нашым агульным малазямельлі немагчыма. Можна аднак злучыць інтарэсы пчаляра з інтарэсамі хлебароба або агародніка і тады атрымліваць дваякую а то і трaякую карысьць.

Медадайныя расьціна можам разьдзяліць на некалькі групаў:

I. Фруктова-медадайныя.
2. Варыва-медадайныя.
3. Кармова-медадайныя.
4. Гаспадарска-медадайныя.
5. Насенна-медадайныя.
6. Прамыслова-медадайныя
7. Лекарска-медадайныя
8. Дэкаратыўна-медадайныя
9. Жываплоты
IO. Выключна медадайныя.

Разглядзім бліжэй кожную паасобную групу.

I. Кожны ведае, якімі вясёлымі пчалінымі зыкамі напаўняецца садок у пару яго красаваньня. З самай раньняй вясны, як толькі пачынае цьвясьці агрэст, парэчкі, маліны, аж да тае пары як адцьвітаюць фруктовыя дрэвы, кожны кусьцік, кожнае дрэва ў садзе дае пчолам багаты і самы раньні пажытак. Дзеля гэтага кожны гаспадар, а тым больш пчаляр-спэцыяліст павінен паклапаціцца каб мець пры хаце большы ці меньшы садок; праца пры ём невялікая, а карысьці шмат і бязпасярэдня і праз пчолы.

2. Далей ідуць варыва. Хіба не знойдзецца гаспадыня, катора б, як толькі сьнег зыйдзе, не пачала кратацца каля гароду сеючы тое ўсё варыва якое ў восені павінна запоўніць яе варыўню і праз зімовыя месяцы пракарміць сямейку. Мо нават ня кожны ведае, што гэтакая звычайная варыва, як агуркі, мак, шальбабон /фасоля/ і інш. належаць да медадайных. Аднак так ёсьць і яны даюць пчолам пажытак хаця і ня вельмі багаты.

3. Ня можа ён зраўняцца з тым пажыткам, які прыносяць пчолам расьціны кармова-медадайныя. Даволі успомніць сэрадэлю, віку, пялюшку і інш. з якімі нашыя селяне што раз лепш знаёмяцца.

З канюшыны чырвонай пчолы бяруць нектар /сок/ вельмі рэдка, хіба тады, калі канюшына расьце слаба і мае маленькія галоўкі, гэта дзеля таго, што пчолы маюць кароткія трубачкі і ня могуць дастаць нектару з глыбіні даволі доўгіх і вузенькіх кветачак. Але ёсьць іншыя канюшыны напр. белая дзяцеліна і швэдзкая, якія даюць пчолам аграмадны пажытак. Практычныя пчаляры радзяць сеяць гэтыя канюшыны разам з чырвонай у такім стасунку: 2 гарцы чырвонай, поўгарца швэдзкай, поўгарца белай, а да таго дадаць поўгарнца цімафейкі, травы таксама для пчол карыснай. Белая канюшына, як самая раньняя цьвяце ўжо ў пачатку чэрвеня; ў палове гэтага месяца разрастаецца і пачынае цьвясьці чырвоная, але пачакаўшы некалькі дзён выбіваецца з гушчару швэдзкая і пакрывае поле сваімі ружовымі кветкамі. Дзе недахват лугоў і балот, там часта сеюць мешанкі на зялёную пашу для жывёлы. Вось і тут трэба помніць аб пчолах; даволі дзеля гэтага падбіраць на мяшанкі такія расьціны, як віка, пялюшка, гарох і г.д.

/працяг будзе/.

Календарык
медадайных расьцін.

У жніўні цьвятуць:

Агурочнік	Канюшына швэдзкая	Уплаўнік
Агуркі	Мэліса	Заложнік
Асацец дзікі	Со[illegible]	Дэлдзяк
Асацец грэцкі	Рэзэда /кветка/	Залётнік
Баркун жоўты	Сэрадэля	Заячая капуста
Дзяцеліна	Шальбабон	Пазлотка
Гарбуз	Верас	Макі Шарлея
Грэчка	Фацэлія /позная для пчол/	Дзярошка
Ізоп	Шанта /белая крапіва/	Сонешнік дэкаратыўн.

> Пчаляр-Беларус,
> калі Ты яшчэ не сябра
> Беларскага Коопэрат.Таварыства
> Пчала,
> дык зараз-жа запішыся.

НЕКАЛЬКІ СЛОЎ У СПРАВЕ ЗЁЛАК.

Таварыства "Пчала" распачынаючы акцыю прапаганды збору мядова-лекарскіх зёлак разьлічвала,што ў сучасны мамэнт цяжкага крызысу і агульнага зьбяднеьня акцыя гэтая будзе на часе і знойдзе прыхільнікаў. І,як аказалася,надзея Т-ва зусім была слушная. Ня толькі што нашыя селяне, безработныя і вучнеўская моладзь узяліся за збор зёлак і стала прысылаюць ды прыносяць у Т-ва "Пчала" большыя ці меньшыя колькасьці розных гатункаў,але нават нашыя браты беларусы ў Амэрыцы зацікавіліся гэтаю справаю і хочуць узяць у свае рукі гандаль нашымі зёлкамі пакульшто ў гор. Чыкаго.

Заграніца наагул патрэбуе шмат лекарскіх зёлак,а асабліва Паўночная Амэрыка,дзе работнік дарагі і збор мяйсцовых зёлак не аплачываецца ды апрача таго шмат якія зёлкі,каторых у нас аграмадныя колькасьці там зусім не растуць. Год у год тысячы кіляграмаў нашых зёлак скупляных па вёсках дробнымі гандлярамі,праз розных агентаў ды вялікія гандлёвыя фірмы вывозіцца ў Амэрыку. І так кожная партыя зёлак праходзіць праз рукі некалькіх асоб і кожны на гэтым зарабляе. Сягодня,дзякуючы зацікаўленьню гэтай справай Беларускай Арганізацыі ў гор.Чыкаго,мы можам свае зёлкі высылаць туды бяспасярэдня,што дасьць нам магчымасьць плаціць лепшыя цэны нашым зьбірачом,разумеецца тады,калі будзем атрымліваць тавар першай якасьці.Гэты апошні варунак неабходны каб заваяваць рынак для свайго тавару і пабіць канкурэнцыйныя фірмы,якія дагэтуль зёлкі ў Чыкаго дастаўлялі.

Трэба каб нашыя зьбірачы, а тымбольш праслухаўшыя курс аб арганізацыі збору і гандлю лекарскімі зёлкамі,ўзялі пад увагу ўсе выгады,якія дасьць такі безпасярэдні гандаль з заграніцай і I/ прыкладалі якнайбольш стараньня зьбіраючы і прыгатаўляючы зёлкі, 2/ не сьпяшаліся прадаваць свой тавар розным гандлярам. Дробныя гандляры часта на дарозе пераймаюць фурманкі,або жанчын з сырымі зёлкамі ды скупляюць іх за бязцэн. З купленым таварам ня робяць сабе ніякай цэрамоніі: сушаць іх над хлявамі,мяшкі з гатовымі зёлкамі трымаюць у складах з рознымі сьмярдзючымі таварамі,як газа,селядцы і г.п.,сьпяць на іх і г.д. Гэтакія зёлкі зразумела трацяць сваю вартасьць і прадаюцца па вельмі малой цане,а апрача таго псуюць апінію нашым зёлкам.

Ад нас залежыць падняць іх вартасьць і прыдбаць сабе лепшую карысьць.

Ня трэба чакаць,ня трэба адкладаць!

Не забывайце,грамадзяне,што запатрэбаваньне на зёлкі ў ж о ё с ь ц ь , дык прыступайце зараз-жа да працы і зьбірайце старанна ўсе тое,што яшчэ можна зьбіраць /Гладзі календарык зборкі/.

У канцы мусім прыпомніць адну важную рэч. Не ганяйцеся каб сабраць шмат розных гатункаў,выбірайце сабе адно,дзьве,тры зёлкі ды такія,якіх у Вас шмат і зьбірайце іх якнайбольшую колькасьць.

> Зьбіраючы зёлкі -помні аб будучыне.Астаўляй дзе-ня-дзе паасобныя расьціны на развод.

Старaймася ўсё выкарыстаць.

Надыходзячая восень прымушае зноў парушыць справу, якая хаця ня
мае нічога супольнага з пчалярствам, ані з лекарскімі зёлкамі, але вык-
лікана гаспадарча-гандлёвымі патрэбамі і мусіць заняць мейсца на ста-
ронках нашае часопісі. Гэта справа насеньня дзікіх яблыняў і грушаў.
Сухая вясна і вялікі лік шкоднай мошкі вынішчылі шмат школак, якія
трэба засяваць нанова. Запатрэбаваньне на насеньне дзікіх яблыняў і
грушак прадбачыцца вялікае і -паўторыцца старое зьявішча: насенныя фір-
мы будуць выпісываць насеньне з заграніцы -бо краёвага н... каму зьбі-
раць! -Чаму гэта? Чым гэта вытлумачыць? Няўжож мы, жыхары Заходняй Бела-
русі гэтакія багатыя, што спакойна глядзім, як марнуецца дабро, а залатоў-
кі плывуць заграніцу. А што ў нас насеньне ёсьць і сабраным быць па -
вінна гэта ведаюць і ў іншых краёх; доказам можа служыць факт, што ў
мінулым годзе Эстонія запатрэбавала ад аднэй віленскай насеннай фірмы
вялікай колькасьці насеньня, якога разумеецца нябыло і як Эстонія, так
і Вільня выпісывалі яго з Вены. -У 1931 годзе адна толькі віленская
фірма выпісала з Парыжа 12 кіл. насеньня дзічак, якія там гадуюцца су -
мысна дзеля прадукцыі насеньня.
У прашлым годзе на старонках "Шляху Моладзі" быў зьмешчаны заклік
да нашай моладзі, каб зьбірала насеньне дзічак. Нажаль бяз рэзультатаў.
Сягоднязварочваемся да пчаляроў, якія павінны быць навучаны прыкладам
пчолкі, што з дробных капеляк нэктару складае цэлыя плястры-багацьце
вульля.
Не пазваляйце, каб насеньне дзічак дарма прападала. Зьбірайце са-
мі, заахвочывайце другіх. Праца гэта лёгкая і не марудная, заўсёды ап-
лоціцца.
Сабраўшы сьпелыя дзікія яблыкі ці грушы /з чорнымі зярнятамі/ сы-
пем у бочку закапаную ў хляве /дзеля цяпла/, перасыпаючы кожны пласт
зямлёй. Калі яны добра перагніюць, выбіраем іх на рэшэта і пераціраем
рукамі, палІваючы ўвесь час вадою. На рэшаце астануцца чыстыя зярняты.
Перасушываем іх на сітах ці рэшэтах на вольным паветры. У печах сушыць
нельга, бо зярняты страцяць здольнасьць прарастаньня. Да часу прадажы
трымаем у сухім мейсцы.
У прошлым годзе за 1 кгр. насеньня яблыкаў плацілі 5 залатовак,
грушак -7 залатовак. -Сёлетнія цэны яшчэ ня усталены, але ў кожным вы-
падку ніжэйшыя ня будуць, а можа нават падымуцца.
Пэўныя цэны падамо ў наступным номеры "Бел. Борці".
Насеньне дзічак кожны зможа прадаць праз пасярэдніцтва Т-ва
"Пчала".
У выпадку, калі б сабранага насеньня прадаць не ўдалося, заўсёды мо-
жна яго выкарыстаць закладаючы школку дзічак, якія маюць вялікі збыт.
Віленшчына мае толькі адну школку дзічак уласьнік якой прадае
дзічкі па 120 залат. за 1000, ў той час, як школкі ў гор. Плоцку бяруць
за тысячу па 60 зл. Жыхары віленшчыны больш ахвотна купляюць дзічкі
мяйсцовыя, прыстасаваныя да тутэйшага клімату, чым прывазныя, але па-
двойная цана шмат каго палохае.
Заложыўшы школку і паставіўшы на дзічкі нармальную цану, заўсёды
можна лічыць на добры збыт.

Астап Вішня

Як я вучуся пчаляраваць..

/Праўдзівае здарэньне/

Гасьціў я неяк на вёсцы ў вельмі добрага чалавека, Сымона Андрэя-
віча, народнага вучыцеля і вельмі практычнага пчаляра...
Сымон Андрэявіч быў вельмі ласкавы і ўзяўся навучыць мяне пчаля-
раваць, даказваючы мне, ўсімі спосабамі, што пчалярства вельмі даход -
ная штука, а добра наладканая пчалярства вельмі вялікая дапамога на -
роднай гаспадарцы.
Учыце, кажу... Будзем, -кажу, -народную гаспадарку палепшаць.
Узяліся, значыцца, мы вучыцца... Спачатку ўсё пашло добра... Ужо
я ведаў, што драўляная скрынка, дзе гудзяць пчолы, завецца -вульлей.
Дзірачка, куды пчолы ўваходзяць і скуль вылазяць -гэта вылет.
Даведаўся я пра калады і пра рамовыя вульлі...
Паказваў пальцам на пчальнік:
- Гэта Дадан!
- Гэта Лявіцкі!
Коратка кажучы, радаваўся і я, радаваўся і Сымон Андрэявіч.
- З вас, -казаў мне Сымон Андрэявіч - не благі будзе пчаляр...
- Пастараюся, -кажу. -Вельмі ўжо, кажу, мёд салодкая і смашная штука.
- Вельмі ўжо, кажу, мне пчалярства падабаецца.

Прачытаў мне Сымон Андрэявіч лекцыю пра тое, якая карысная штука мёд, як лекі, як пчальнік добра ўплывае на чалавека, як ён дапамагае бюджэту і т.д. і г.д.

Буду, думаю сябе, пчаляраваць. Кожны вечар мы елі мёд... І з гарбатай мёд елі. І з піражкамі мёд елі.

Буду, думаю сябе, пчаляром.

- А заўтра - кажа Сымон Андрэявіч, - будзем вульлі аглядаць, будзем праверацъ. Пазнаёмлю Вас з пчалінай сямьёй, з унутраным жыцьцём.

Настала заўтра.

- Пойдзем.

- Пойдзем, - кажу.

- Сеткі надзяваць ня будзем, бо пчолы - кажа Сымон Андрэявіч, - у мяне спакойныя "Італіянскія". Вы толькі стаіце, спакойненька, не размахівайце рукамі. Спакойна стаіце. Найгалоўнейшае спакой... І ніякая тады вас ня ўкусіць...

- Пастараюся, - кажу, - стаяць спакойна. І рукамі махаць ня буду.

Мы пайшлі...

Зьняў Сымон Андрэявіч стрэшку.

Дзээ... Дзээ...

Нічога... Нічога... Гэта яны спачатку, зараз супакояцца. Не махайце рукамі.

- А хіба я махнуў?

- Махнулі!

- Гэта сама рука махнула!

- Не махайце!

- Ой, глядзіце, пане вучыцель самі, а я ўцяку! Ай!

Рушыў я паміж вішняком... Заплюшчыў вочы і перавярнуў калоду...

- Падайце, - крычыць Сымон Андрэявіч.

- Мусіць не ўпаду, - крычу. Куды мне далей уцякаць

Ускочыў я ў крыніцу. Занурыў галаву ў ваду... Выскачыў потым з яе, пераскочыў праз плот ды на вуліцу да школы.

Дзеці пакінулі забаву:

- Глядзіце, як дзядзька шпарка бяжыць! Чаго гэта ён так?!

Ускочыў я ў школу... Прыбегла Ганна Сьцяпанаўна... Пачала вытрасаць "італьянку" з-за пазухі...

Потым прыкладалі дзесяткі, амоніякам націралі.

Апух я і вельмі мне ўсё балела.

....

Ня вывучыўся я на пчаляра. Давялося iсьці ў пісьменьнікі...

Усё ў мяне ў пчалярстве добра. І я яго разумею. І карысьць з яго разумею...

Вось толькі не магу, каб не махаць рукамі.

Прабачце, сябры, маей руцэ; яна ня можа ўтрымацца...

А пчол усё-ткі разводзіце...

Толькі не размахівайце, калі ласка, рукамі.

З украінскага пераклаў А. В о й н і ч .

З ЧУЖОГА ЖЫЦЬЦЯ.

VI У с е с л а в я н с к і П ч а л я р с к і К а н г р э с. Сёлета 26 да 30 жніўня ў Белградзе /Югаславія/ адбудзецца VI-ты Усеславянскі Пчалярскі Кангрэс, злучаны з пчалярскай выстаўкай.

У г о д к і. У месяцы траўні с.г. славэнскія пчаляры сьвяткавалі 200-летнія ўгодкі нараджэньня свайго вялікага пчаляра Антона Яншы, які радзіўся ў 1734 г. ў сямьі беднага селяніна пчаляра славэнца з Брэжніцы ў Краіні. Будучы маладым хлапцом Антон Янша вельмі цікавіўся навукай і дзякуючы дапамозе заможных людзей вучыўся раней ў сваей бацькаўшчыне, а пасьля ў Італіі. Вярнуўшыся дамоў у хуткім часе здабыў сабе славу, як паступовы пчаляр. У той час у Аўстрыі, да якой належала Краіна, панавала Марыя Тэрэса, якая вельмі дбала аб падняцьці гаспадаркі, а перадусім пчалярства. Пачуўшы аб Яншы, запрасіла яна яго на вучыцеля пчалярства. А. Янша быў першым вучыцелям рацыянальнага пчалярства і выдаў дзьве паважныя кніжкі, ў якіх апісвае свае способы пчаляраваньня.

З Т - в а " Р і й ". У 1933 годзе Украінскае Кооп. Т-ва "Рій" прадало 25000 кілаграмаў мёду, які атрымлівала ад сваіх сяброў на коміс. Сёлета, пры збольшанай сьвядомасьці сярод украінскіх пчаляроў, справа продажы будзе пэўна выглядаць яшчэ паважней.

З НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ.

Вільня. Сёлета з зімы пчолы вышлі сярэдня. Шмат у каго адмёрла з голаду, бо, ведама, летась быў слабы збор, і пчолы мелі невялікія запасы мёду. Вясна хоць і раньняя была, але у пэўны час стаялі халады, якія затрымалі развіцьцё маладых пчолаў. Далей пайшла засуха, якая пакрылася з пачаткам медабраньня. З ліпаў пчолы амаль зусім нічога не сабралі дзеля тэй прычыны, што ліпы сёлета цьвілі вельмі слаба, - можа нават таму, што было вельмі суха. Як адцьвілі ліпы, пайшлі дажджы, але ў Вільні ўжо нямагчыма было браць за выключэньнем гародніх ды садовых расьцінаў. Грэчкі у ваколіцах майго пчальніка амаль зусім ня сеюць. Скончылася медабраньне з благімі скуткамі: пчолы узмацаваліся, ншчэ ўсё множацца, а мёду ў абрэз, а некаторыя трэба і падкарміць. Словам, сёлет пчаляры ў Вільні зыску ня маюць. І для пчол і для пчаляроў год цяжкі.

Дзялятычы, пав. Навагрудзкі. У Дзялятычах і аколічных вёсках справа пчалярства стаіць памысна. У ваколіцы ёсьць болей як паўтары сотні вульлёў, з якіх на Дзялятычы прыпадае сорак штук. Усе пчаляры, за вынятнам аднаго вучыцеля паляка, сьвядомыя беларусы, тады як па за Д-мі пчалярствам цікавяцца найбольш асаднікі. Пчаляры у нас больш пачынаючыя. Ёсьць пара і старых, якія ахвотна дапамагаюць пачынаючым як парадамі, так і натурай. Пераважаючая сыстэма вульлёў Дадан-Блята. Штогод прыходзіцца купляць да 20 кіляў вузы. Закуп робім праз Навагрудскі сындыкат. Даведаўшыся аб узнаўленьні працы у Беларускім Т-ве Пчала пчаляры беларусы лічуць сваім абавязкам навязаць сувязь з роднай арганізацыяй, уступіць у сябры і весьці праз Пчалу свае гандлёвыя транзакцыі.

Табярышкі, пав. Віленска-Троцкі. Табярышкі ціхі куток нашай Бацькаўшчыны. Вузкія палоскі, з якіх трэба пракарміць вялікія сем'і, змушаюць шукаць заработку, каб магчы як-колечы пражыць. Але дзе і як зарабіць ломіць галаву наш селянін і нічога ён прыдумаць ня можа, бо зарабіц цяпер няма дзе. І вось якраз у пару Беларускае Т-ва "Пчала" сарганізавала аддзел лекарскіх зёлак, што можа заспакоіць большыя кругі безработных масаў, даючы ім пэўную працу ў кожнай пары году Ахвота ў нас да зьбіраньня зёлак ёсьць вялікая тым больш, што гэтай справай могуць заняцца старыя й малыя, каторыя да іншай працы ня здольныя. Аднак, на жаль, у гэтай справе малое ўсьведамленьне і вельмі было б пажадана, каб гэтым заняліся гурткі Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ... у Вільні, Ковенунах і іншых мясцох.

Паглядзімо цяпер, як стаіць справа ў нашай ваколіцы з пчалярствам. На самым пачатку мушу зазначыць, што пчаляры ў нас самавукі і пакуль яны здабудуць якуюсьці практыку, бяруць вельмі пацярпіць і карысьці з яе гаспадар будзе меці мала. Тыя вось, каторыя на пчалярстве знаюцца добра, часта маюць шмат раёў і ня могучы іх усіх утрымаць у сябе, адпаюць на су палку другім. Самастойных пчаляроў у нас ёсьць вельмі мала. Так і выглядаюць зёлкава-пчалярскія справы ў нас цяпер. У будучыні аднак спадзяюся, што гэтыя справы пойдуць хутка наперад, а яшчэ шпарчэй - калі адпаведная беларуская літэратура і часопісі будуць друкавацца і лацінкаю, бо на жаль гражданкай у нас умеюць чытаць вельмі мала.

ХРОНІКА Т-ВА "ПЧАЛА".

У чэрвені-ліпені с.г. Т-ва вядала завочныя курсы па збору мядовалекарскіх і лекарскіх зёлак, у апрацаваньні гр. Л. Войцікавай і студэнта медыка Віленскага Універсытэту В. Тумаша. Курсы сабралі 54 падпісчыкаў, якія рэкрутаваліся са ўсіх слаёў беларускага грамадзянства. Найбольшы лік падпісчыкаў прыпадал на паветы Гарадзенскі, Маладэчанскі, Баранавіцкі і Чесьвіцкі па 5, Дзісьненскі -4, Ваўкавыскі, Пастаўскі, Стаўпецкі, Косаўскі і Віленскі па 3, з рэшты паветаў па 2 і 1 курсанту.

Цэны мёду. У Вільні 20 жніўня за мед плацілі: у гурце па 1зл.60 гр. - 1зл.70 гр. за кілягр.; дэталічна мёд прадаваўся па 2 зл.

Ветліва просім прысылаць нам усялякія песьні, казкі, прыказкі, жарты і апісаньня звычаяў, зьвязаныя з пчоламі, пчалярствам і зёлкамі.

Цэньнік на зёлкі будзе надрукаваны у наступным № "Бел. Борці", які выйдзе пасьля 20 верасьня.

Падаемо сьпісак зёлак, на якія ёсьць запатрэбаваньне ў краі: карэньня: панчошніку ці сабачага мыла, пырніку, арніку, малачаю лапуха, валяр'яну і воўчай ягады; лісьцё: чарніцаў, мачачмчліку,

воўчай ягады, блёкату і бабку; ц ь в е т : васілька і ерніку; з е л ь - л е /цэлая расьціна/ : расіцкі, сардэчніка ці цэнтуры, сьвятаянскага зельля, цанцылеі /чыстацелу/ ; я г а д ы: маліны, суніц /пазёмак/, чарніц і ялаўца; кара крушыны, н а с е н ь н е : кміну і кропу; пылок дзеразы, сцарыньнік /ражкі/, цьвет ліпы.

П А Ш Т О В А Я   С К Р Ы Н К А.

Е.Мамчыцу. Карэспандэнцыю зьмяшчаем. Статут высылаецца. Прышліце карэспандэнцыю аб сёлеташнім мёдазборы

гр.Корчыку. Запатрэбаваньне на насеньне сасны і ёлкі толькі рэдкія выпадкі, і зьбіраць яго не аплоціцца. Зьвярніце увагу на арт."Стараймася ўсе выкарыстаць".

П.Гапанёнку. Адказ на пісьмо выслалі. Паведамце аб сваіх далейшых праектах і пачынаньнях. Ці атрымалі адказ ад інж.Гаўрыленкі. Напішыце як стаіць у вашай ваколіцы справа пчалярства і мёдазбору.

У в а г а. Падпішчыкаў завочных курсаў, якія не урэгулявалі сваіх рахункаў, Т-ва "Пчала" просіць прыспяшыць з высылкай грошаў.

У в а г а. Прысылайце ўсялякія запытаньні і на старонках нашае часопісі атрымаеце падрабязныя адказы і інфармацыі. Хто апрача таго хоча атрымаць адказ лістоўна, павінен прыслаць паштовую марку на 30 гр.

Выдавец-Рэдактар Л. В о й ц і к а в а.